# ВЕСТНИК МГИРО

***Научно-методический журнал***

*Издается ежеквартально*

*Издается с сентября 2010 года*

**MSIDE NEWSTELLER**

*Scientific-methodical magazine*

*Is Published triennial*

*Since September 2010*

**№ 3 (22)**

**июль-сентябрь 2015 г.**

В соответствии с приказом
Председателя Высшей аттестационной комиссии
Республики Беларусь от 20.03.2015 г. № 81
журнал включен в Перечень научных изданий
Республики Беларусь для опубликования
результатов диссертационных исследований
по историческим, педагогическим
и психологическим наукам

Зарегистрирован
Министерством информации Республики Беларусь
в Государственном реестре средств массовой
информации за № 1090 09.12.2010 г.

**Главный редактор** Татьяна Ивановна Мороз
**Ответственный за выпуск** Н. Н. Пинчук
**Редактор** И. Л. Бондарь
**Верстка** Н. Н. Пинчук
**Дизайн обложки** Н. Ф. Стренковская

Подписано в печать 24.07.2015.
Выход в свет 24.08.2015.
Формат 60x84/8. Бумага офсетная.
Гарнитура Cambria. Ризография.
Усл.печ. л. 11,2. Уч.-изд. л. 9,0. Тираж 330.
Заказ 134. Цена свободная.

Издатель и полиграфическое
исполнение ГУО «Минский городской
институт развития образования»
Свидетельство № 1/176 от 12.02.2014.

ЛП № 02330/460 от 03.03.2014.
Адрес редакции: 220034, г. Минск,
пер. Броневой, 15а, тел. 294-85-51
e-mail: mgiro@minsk.edu.by
Адрес типографии: 220034,
г. Минск, пер. Броневой, 15а.

Статьи в рубрику «Научные публикации» рецензируются. Полное или частичное воспроизведение или размножение любым способом материалов, опубликованных в настоящем издании, допускаются только с письменного разрешения издателя. Материалы в рубрику «Образовательная практика» не рецензируются и не возвращаются.

***Редакционная коллегия***

**Т. И. Мороз,** кандидат педагогических наук, доцент;

**С. П. Стренковский,** доктор исторических наук, доцент, заместитель главного редактора;

**Л. Н. Воронецкая,** кандидат педагогических наук, доцент;

**Н. М. Забавский,** доктор исторических наук, профессор;

**Н. Л. Кузьминич,** кандидат педагогических наук, доцент;

**В. А. Листратенко,** кандидат педагогических наук, доцент;

**А. М. Лютый,** доктор исторических наук, профессор;

**О. А. Минич**, кандидат педагогических наук;

**В. Н. Наумчик,** доктор педагогических наук, профессор;

**Л. В. Орлова**, кандидат психологических наук, доцент;

**Б. В. Пальчевский,** доктор педагогических наук, профессор;

**Л. А. Пергаменщик,** доктор психологических наук, профессор;

**Т. И. Пучковская**, кандидат педагогических наук;

**О. М. Старикова,** кандидат педагогических наук, доцент;

**О. В. Толкачева,** кандидат педагогических наук, доцент;

**В. В. Чечет,** доктор педагогических наук, профессор;

**В. А. Янчук**, доктор психологических наук, профессор;

**Л. Г. Венцерева**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нодательство периода расцвета абсолютизма. – 528 с.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1569. Воп. 1. Сп. 1.
10. НГАБ. – Ф. 1569. Воп. 1. Сп. 16.
11. НГАБ. – Ф. 1569. Воп. 1. Сп. 17.
12. НГАБ. – Ф. 1569. Воп. 1. Сп. 89.
13. НГАБ. – Ф. 1569. Воп. 1. Сп. 78.
14. НГАБ. – Ф. 1569. Воп. 1. Сп. 79.
15. НГАБ. – Ф. 1569. Воп. 1. Сп. 96.
16. НГАБ. – Ф. 149. Воп. 3. Сп. 6.
17. НГАБ. – Ф. 149. Воп. 3. Сп. 24.
18. НГАБ. – Ф. 1569. Воп. 1. Сп. 99.
19. Купченко, К.В. Городская политика Екатерины II и её реализация в Смоленской губернии / К.В. Купченко // Гуманітарний журнал Національного гірничого університету. – 2012. – № 2-3. – С. 145–154.
20. НГАБ. – Ф. 24. Воп. 1. Сп. 3.
21. НГАБ. – Ф. 10. Воп. 1. Сп. 1.

**SUMMARY**

In the article the author researches the activities of municipalities and self-government after the accession of Belarus to the Russian Empire as a result of the three divisions of Poland. The author examines the legal bases of activity of the institutions of urban government and management: Setting to control the provinces in 1775, and Charter on the rights and benefits to cities of 1785. On the example of Minsk the author shows the structure, the composition and activities of the town Council and city Council. The activity of the regional magistrate, as an institution that throughout 1795 to 1797 was the head of the system of bodies of municipal government and self-government of the Minsk province is also analyzed. The evolution of workshops management is mentioned.

*Статья сдана в редакцию 07.08.2015*

УДК 94(476) "19":37

***П. А. Трубчык,***
*дацэнт кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі*
*УА "Беларускі Дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка",*
*кандыдат гістарычных навук*

## ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ Ў ЗАХОДНІХ ГУБЕРНЯХ У ПАЧАТКУ XX СТ. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ДЗЕЙНАСЦІ ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЫ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ)

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці развіцця адукацыі ў заходніх губернях ў пачатку XX ст. Даследуюцца пазіцыі дэпутатаў у сферы адукацыйнай палітыкі. Характарызуюцца спробы рэфармавання адукацыйнай сістэмы, а таксама ступень іх рэалізацыі на беларускіх землях.

На мяжы XIX і XX стст. сістэма адукацыі на тэрыторыі Беларусі, як і ў цэлым па Расійскай імперыі, адрознівалася шматтыпнасцю школ, падначаленнем навучальных устаноў розным ведамствам, адсутнасцю пераемнасці паміж пачатковай і сярэдняй школай, наяўнасцю дзяржаўных і прыватных сярэдніх школ, саслоўна-класавым характарам сярэдняй і вышэйшай адукацыі, вызначаным абмежаваннем для асоб жаночага полу ў атрыманні вышэйшай адукацыі. У пачатку XX ст. гэтыя характэрныя рысы адукацыі значна відазмяніліся пад уплывам сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця, а таксама шырокага нацыянальна-культурнага і грамадска-педагагічнага руху, што ўзнік на беларускіх землях. Прасачыць гэтыя змяненні ўяўляецца магчымым на прыкладзе дзейнасці Дзяржаўнай думы Расійскай імперыі, дзе знаходзілі сваё адлюстраванне шматлікія спробы рэфармавання адукацыйнай сістэмы.

Педагагічная думка, а таксама палітыка царызму ў галіне адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. даследуюцца ў манаграфіі С. В. Снапкоўскай [1]. Некаторыя аспекты заяўленай праблемы таксама знайшлі сваё адлюстраванне ў манаграфіі М. М. Забаўскага, якая прысвечана дзейнасці дэпутатаў ад паўночна-заходніх губерняў у Думе 1-4 скліканняў [2].

Пытанні адукацыі ў I-IV Думах разглядаліся пры абмеркаванні ўрадавай праграмы школьнай рэформы (законаў аб увядзенні ўсеагульнай пачатковай адукацыі, аб мове выкладання ў пачатковых школах, аб пачатковых вучылішчах, аб вышэйшых пачатковых вучылішчах, аб прыватных навучальных установах і інш.), бюджэту Міністэрства народнай асветы, мясцовага земскага і гарадскога самакіравання.

10 лістапада 1907 г. адбыліся выбары ў Думе членаў камісіі па народнай адукацыі. У яе абавязкі ўваходзіла распрацоўка і першапачатковае абмеркаванне законапраектаў у галіне адукацыі і асветы прадстаўнікамі розных партый. Камісія таксама збірала ўсе звесткі, што датычыліся ўнесеных законапраектаў, прадстаўляла на агульным сходзе тэкст і свае заключэнні да іх. У камісіі, як і ў самой Думе, ні адна з партый не мела вызначальнай большасці, але колькасную перавагу мелі члены «Саюза 17 кастрычніка». Склад камісіі рабіў непазбежным сутычкі і суперніцтва ў ёй. Пры камісіі было створана 6 падкамісій па ўсіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

галінах школьнай справы.

Вострыя дыскусіі адбываліся вакол пытання аб навучанні на роднай мове. Дэпутат ад Польска-літоўска-беларускай групы К. Завіша ў выступленні 14 сакавіка 1908 г. адзначыў, што палажэнні Закона ад 1 мая 1905 г., якія датычацца ўжывання роднай мовы, не выконваюцца. Між тым, на яго думку, сістэма адукацыі павінна ўлічваць як індывідуальныя, так і этнічныя асаблівасці вучняў. Дэпутат, у прыватнасці, прапанаваў дазволіць выкладанне на роднай мове ў прыватных пачатковых вучылішчах [3, с. 565-569].

На тэрыторыі Беларусі пачатковую адукацыю давалі народныя і гарадскія вучылішчы, якія адносіліся да Міністэрства народнай асветы, а таксама царкоўнапрыходскія школы і школы пісьменнасці, што падпарадкоўваліся Сіноду. Народныя вучылішчы былі двух тыпаў: аднакласавыя, ці ніжэйшыя пачатковыя з трохгадовым тэрмінам навучання, і двухкласавыя з 5-6-гадовым навучаннем. Колькасць двухкласавых народных вучылішчаў у паўночна-заходніх губернях была нязначнай. Так, на 1 студзеня 1905 г. дзейнічала 1314 народных вучылішчаў (з іх 65 – двухкласавыя), дзе налічвалася 106 196 навучэнцаў, на 1 студзеня 1908 г. – 2034, на 1 студзеня 1914 г. – 4 784 вучылішчаў (з іх 531 двухкласавыя) з 304 745 навучэнцамі [1, с. 14]. Такім чынам, на пачатку XX ст. сетка ўстаноў пачатковай адукацыі расла вельмі хутка. Гэта прадвызначыла вялікую актыўнасць у абмеркаванні пытанняў пачатковага навучання дэпутатаў ад заходніх губерняў, якія прадстаўлялі ў Думе інтарэсы розных этнічных супольнасцей.

29 сакавіка 1908 г. 37 дэпутатаў Думы, галоўным чынам кадэты, прадставілі праект асноўных палажэнняў аб мове выкладання ў пачатковых школах у заходніх губернях. Аўтары законапраекта прапаноўвалі ўвесці выкладанне на роднай мове з 1908/09 навучальнага года пры абавязковым вывучэнні рускай мовы як дзяржаўнай. 26 мая 1909 г. запыт аб праекце быў перададзены ў камісію па народнай адукацыі [4, л. 1, 2].

У кастрычніку 1910 г. дакладчык ад камісіі па народнай адукацыі па пытанні аб увядзенні ўсеагульнага пачатковага навучання акцябрыст В.К. фон Анрэп заявіў, што пасля спрэчак камісія прыйшла да высновы, што выкладанне павінна адбывацца на рускай мове, аднак у першыя два гады дазвалялася выкладанне на роднай мове навучэнцаў з умовай, што і руская мова павінна выкладацца з першых трох месяцаў навучання [5, с. 11].

У сваю чаргу, дэпутаты ад нацыянальных груп падверглі крытыцы царкоўна-прыхадскія школы, якія, на іх думку, даўно не адпавядалі патрабаванням насельніцтва Паўночна-Заходняга краю [6, с. 410–413]. Найперш гэта тычылася рэлігійнай адукацыі ў так званых «іншародных» школах, і дэпутаты выступілі за роўнасць рэлігійных адукацыйных праграм. Акцябрысты выступалі за перадачу школьнай справы Міністэрству народнай асветы, адабраўшы гэтыя функцыі ў Сінода. Кадэты ў Думе прапаноўвалі поўнасцю перадаць школьную справу органам мясцовага самакіравання. У выніку быў прыняты акцябрысцкі варыянт.

Вялікія надзеі на рэфармаванне адукацыйнай сістэмы дэпутаты ад заходніх губерняў ускладалі на ажыццяўленне земскай рэформы. У сакавіку 1911 г. закон аб земствах быў распаўсюджаны на Віцебскую, Магілёўскую і Мінскую губерні, у якіх былі створаны губернскія і павятовыя ўправы. Дзякуючы фінансавай падтрымцы земстваў колькасць народных школ на тэрыторыі Беларусі павялічылася з 2043 у 1908 г. да 4784 у 1914 г. За гэты ж тэрмін колькасць вучняў на аднаго сялянскага настаўніка скарацілася з 71 да 58 [1, с. 51].

Прыярытэтным накірункам земскага фінансавання з'яўлялася пачатковая школа, за якой ішлі вышэйшыя народныя вучылішчы, народныя чытальні, бібліятэкі, школы для дарослых, народныя дамы. Значную ўвагу земствы надавалі стварэнню прафесійных пачатковых школ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў (сельскагаспадарчых, ветэрынарных, медыцынскіх). Разам з тым неабходна адзначыць, што за асветніцкай дзейнасцю земстваў стаялі палітычныя інтарэсы самадзяржаўя, накіраваныя на ўмацаванне сваёй прысутнасці ў краі.

У пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі паскорыліся тэмпы росту колькасці сярэдніх навучальных устаноў і іх вучняў. Аднак у параўнанні з пачатковай, сярэдняя адукацыя на беларускіх землях развівалася больш марудна. У пачатку 1905 г. тут было 23 сярэднія ўрадавыя навучальныя установы (8 мужчынскіх і 10 жаночых гімназій, 1 мужчынская прагімназія, 3 рэальныя і 1 камерцыйнае вучылішча) з 9117 навучэнцамі. Таксама пашыралася сетка сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, галоўнае месца па колькасці сярод якіх займалі настаўніцкія семінарыі, што выпускалі настаўнікаў для пачатковых школ. У 1905 г. на тэрыторыі Беларусі іх было 4 – у Маладзечне, Полацку, Нясвіжы, Свіслачы. З 1909 па 1916

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гг. было адкрыта 5 настаўніцкіх семінарый: у Рагачове (мужчынская) і 4 жаночыя ў Оршы, Барысаве, Гомелі і Бабруйску. Пачалі працаваць тры настаўніцкія інстытуты: у Віцебску – у 1910 г., Магілёве – 1913 г., Мінску – 1914 г. Настаўніцкія інстытуты не з'яўляліся вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, аднак праграма навучання ў іх была больш разгорнутай, чым у семінарыях. Яны рыхтавалі настаўнікаў для пачатковых школ павышанага тыпу. Выкладчыкі Мінскага настаўніцкага інстытута ў сваёй педагагічнай дзейнасці арыентаваліся ў асноўным на ўзровень сярэдняй школы. Педагагічных навучальных устаноў па падрыхтоўцы настаўнікаў для гарадскіх вучылішчаў і сярэдніх школ на тэрыторыі Беларусі не было. Настаўнікаў для іх прысылалі з Вільні, Масквы, Пецярбурга.

Праблема падрыхтоўкі педагагічных кадраў уздымалася на паседжаннях Думы падчас разгляду бюджэту Міністэрства народнай асветы, яна цесна перапляталася з пытаннямі этнаканфесійных абмежаванняў у сістэме народнай адукацыі. Дэпутаты ад нацыянальных груп ставілі пытанне аб рэформе нацыянальнай адукацыі. Сярод прапаноў адзначалася неабходнасць увядзення выкладання на роднай мове, падрыхтоўкі настаўнікаў, якія валодаюць мовай, ведаюць гісторыю, літаратуру і быт народа і пастаўлены ў адпаведныя матэрыяльныя і прававыя ўмовы, вызвалення школ ад уздзеяння любых палітычных уплываў і месіянерства, адмены адміністратыўных абмежаванняў і неспрыяльных умоў, «у якіх знаходзяцца школы» [7, с. 3417]. Выкладзеныя прынцыпы рэформы народнай адукацыі канкрэтызаваліся, і дэпутаты патрабавалі распаўсюдзіць выкарыстанне роднай мовы на дашкольнае выхаванне, даць магчымасць стварэння прыватных і грамадскіх нацыянальных школ, стварыць кафедры нацыянальных моў і літаратур у вышэйшых навучальных установах і адкрыць вышэйшыя дзяржаўныя педагагічныя навучальныя ўстановы з мясцовымі мовамі выкладання; праводзіць раённыя педагагічныя з'езды, забяспечыць справядлівае размеркаванне бюджэтных сродкаў на народную адукацыю [7, с. 3418]. Дакумент перадалі ў камісію па народнай адукацыі.

Некаторыя дэпутаты ў сваіх выступленнях акцэнтавалі ўвагу на становішчы асобных этнасаў. Дэпутат ад партыі кадэтаў Э. Б. Гурэвіч выказаўся наконт абмежавання яўрэяў у галіне адукацыі. Ён заявіў, што «ў гэтым годзе з пагражаючай відавочнасцю выявілася ўся шкода, якая зыходзіць ад працэнтнай нормы не толькі для яўрэяў, а і для ўсёй краіны» [7, с. 3390]. Крытыку дэпутата выклікалі новыя правілы прыёму ў навучальныя ўстановы, якія ўсталёўвалі норму для яўрэяў у сярэдніх навучальных установах у раёне мяжы яўрэйскай аселасці 15 %. Увядзенне гэтай нормы планавалася праводзіць паступова, паколькі яе тэрміновая рэалізацыя магла б прывесці да ліквідацыі некаторых навучальных устаноў, дзе асноўны кантынгент навучэнцаў складалі яўрэі. Асабліва гэта тычылася камерцыйных навучальных устаноў. У Мінскім мужчынскім камерцыйным вучылішчы ў 1902 г. атрымлівалі адукацыю 47,6 % навучэнцаў-яўрэяў, у 1903 – 48,2, у 1906 – 65,5, у 1911 – 67 %. У мэтах выканання правіл дырэктар Віцебскага мужчынскага камерцыйнага вучылішча сумесна з педагагічным саветам распрацаваў разлічаны на 10 гадоў план зніжэння ўдзельнай вагі навучэнцаў-яўрэяў да 15 %. Прадугледжвалася ў 1911/12 навучальным годзе прыняць 45 % яўрэяў, у 1913/14 – 40, у 1915/16 – 32, у 1918/19 – 20, у 1920/21 – 15 % [8, с. 189].

Камісія па народнай адукацыі падрыхтавала запыт да старшыні Дзяржаўнага савета і міністра народнай адукацыі па прычыне выдання 11 сакавіка 1911 г. палажэння аб устанаўленні нормы для яўрэяў пры допуску іх да здачы экзаменаў у сярэднія навучальныя ўстановы. Аднак даклад камісіі па гэтаму запыту так і не быў разгледжаны [9, л. 11-12].

Характэрнай асаблівасцю дзейнасці яўрэяў у галіне адукацыі з'яўлялася адсутнасць патрабавання ўласнай школы ў месцах кампактнага пражывання яўрэйскага насельніцтва, у адрозненні ад палякаў, літоўцаў, беларусаў, украінцаў і іншых народаў заходніх губерняў. Яны толькі прэтэндавалі на адмену працэнтнай нормы.

Увогуле школьная праблема і асабліва пытанне аб навучанні на роднай мове даволі часта ўздымаліся дэпутатамі ад заходніх губерняў. Менавіта мова выкладання была «адным з самых вострых школьных пытанняў», што выклікала «самую вялікую колькасць дэбатаў, якія дасягалі незвычайнай нярвовасці і напружання» [10, с. 86]. Такая актыўнасць у гэтым кірунку тлумачыцца шматлікімі абмежаваннямі з боку царскага ўрада і стракатым этнаканфесійным складам насельніцтва краю.

Аналізуючы дзейнасць Дзяржаўнай думы ў сферы адукацыйнай палітыкі, неабходна адзначыць, што нягледзячы на значную абмежаванасць, законы, прынятыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Думай садзейнічалі паслабленню вастрыні і напружанасці некаторых пытанняў у галіне адукацыі. У той жа час, вялікія намаганні дэпутатаў ад заходніх губерняў па рэфармаванні сістэмы пачатковага навучання, развіцця нацыянальнай адукацыі былі амаль безвыніковымі. Праекты законаў «Аб увядзенні ўсеагульнай пачатковай адукацыі ў Расійскай імперыі» і «Аб пачатковых вучылішчах» з папраўкамі і дапаўненнямі былі прыняты Думай, аднак праз Дзяржаўны савет прайшоў толькі другі законапраект. Дзяржаўны савет адхіліў таксама любыя пачынанні ў адносінах да нацыянальнай школы.

**Спіс літаратуры**


1. Снапкоўская, С.В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стст. / С.В. Снапкоўская. – Мінск : НІА, 1998. – 192 с.
2. Забаўскі, М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі (1906-1917 гг.) / М.М. Забаўскі. – Мінск : БДПУ, 2008. – 267 с.
3. Государственная Дума. Стенографические отчеты. Созыв III. – СПб. : Гос. типография, 1907–1912. – Сессия I. – Т. 1-3.
4. РДГА. – Фонд 1278. Канцылярыя Дзяржаўнай думы. – Воп. 2. – Спр. 2307.
5. Государственная дума. Третий созыв. Стенографические отчеты. Сессия IV. – СПб. : прил. к газете «Россия». – 1910. – Ч. 1.
6. Государственная Дума. Стенографические отчеты. Созыв III. – СПб. : Гос. типография, 1907–1912. – Сессия II. – Т. 1-4.
7. Государственная Дума. Стенографические отчеты. Созыв IV. – СПб. : Гос. типография, 1912–1917. – Сессия IV. – Т. 1-2.
8. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. – Кн. 1 / А.А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал. : А.А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 584 с.
9. РДГА. – Фонд 1278. Канцылярыя Дзяржаўнай думы. – Воп. 2. – Спр. 2470.
10. Ропп, А.Н. Что сделала Третья Государственная дума для народного образования / А.Н. Ропп. – СПб. : Типография А.С. Суворина, 1912. – [4], 255 с.



**SUMMARY**

The activity of the State Duma of the Russian Empire on educational policy in the western provinces in the beginning of the XXieth century is examined. The attempts of reforming of the educational system are analyzed. The conclusion that the laws adopted by the Duma lessened the tension of some questions in the sphere of educations despite their significant limitations is made. At the same time, great efforts of the deputies from the western provinces to reform the system of the primary education and the development of the national school were almost useless.


*Статья сдана в редакцию 11.02.2015*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ